# Урок біялогіі па тэме “Агульная характарыстыка грыбоў. Шапачкавыя грыбы і іх разнастайнасць” (7 клас)

**Людміла Уладзіміраўна Амельчанка,**
настаўнік біялогіі і хіміі
кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст”
Бярозавіцкай сярэдняй школы Пінскага раёна

**Урок накіраваны на развіццё крытычнага мыслення, уменняў аналізу і сінтэзу інфармацыі, фарміраванне экалагічнай культуры і асноў бяспечных паводзін, а таксама на знаёмства з разнастайнасцю і значэннем грыбоў у прыродзе.**

**Тэма**: Агульная характарыстыка грыбоў. Шапачкавыя грыбы і іх разнастайнасць

**Мэта ўрока.** Мяркуецца, што да канца ўрока навучэнцы будуць:

*ведаць* распаўсюджванне і асяроддзе жыцця, асаблівасці будовы і асноўныя працэсы жыццядзейнасці грыбоў; асноўныя ядомыя і ядавітыя грыбы;

*умець* называць прыкметы адрознення грыбоў і тлумачыць адрозненні грыбоў ад другіх арганізмаў; характарызаваць умовы жыцця грыбоў; выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні аб грыбах для прафілактыкі атручэнняў, якія выкліканы грыбамі, аказваць першую дапамогу пры атручэнні грыбамі;

*валодаць* тэрмінамі і паняццямі: грыбы, шапачкавы грыб, гіфы, міцэлій, пладовае цела.

**Задачы асабістага развіцця.**

Садзейнічаць развіццю навыкаў умення працаваць з тэкстам падручніка і візуальнай інфармацыяй, аналізаваць атрыманую інфармацыю. Садзейнічаць фарміраванню пазнавальнага інтарэса да прадмета, навыкаў адказных адносін да асабістага здароўя і здароўя другіх людзей.

**Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:** табліцы «Шапачкавыя грыбы», «Ядомыя і ядавітыя грыбы»; фота па тэме ўрока.

**Тып урока:** камбінаваны.

## Ход урока

**І. Арганізацыйны этап**

**ІІ. Этап актуалізацыі ведаў і матывацыі на вывучэнне новай тэмы**

***Прыём “Бія-фэйк ці Бія-факт?”***

*На экране (або на дошцы) фотаздымкі:*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

 

*(згенерыравана з дапамогай нейрасеткі Шедеврум).*

– Дакажыце з біялагічнага погляду фэйк ці факт на фотаздымках. Аргументуйце свае прапановы. (*Вучні выказваюць свае думкі, настаўнік прапануе вярнуцца да дадзеннага фота ў канцы ўрока.*)

Аб'яўленне тэмы ўрока. Сумесная пастаноўка мэты ўрока.

**III. Аперацыйна-пазнавальны этап**

Вывучэнне новай тэмы праводзіцца з паэтапным замацаваннем ведаў.

Настаўнік прапануе стварыць Бія-пашпарт Царства Грыбы. *(Можа складацца на працягу ўрока; вучням неабходна прачытаць тэкст на с.51-52, успомніць матэрыял 6 класа па тэме ўрока.)*

1. Царства: Грыбы

2. Грамадзянства: ні расліна, ні жывёла.

3. Прадстаўнікі: маслёнак, былы грыб, мухамор, дрожджы, падбярозавік, пеніцыл і г.д.

4. Асноўныя знешнія прызнакі "жыхароў": аднаклетачныя і мнагаклетачныя, у выглядзе плесені, шапачкавыя грыбы. Часта маюць пладовае цела (надземную частку): шапачка і ножка.

5. Асаблівасці будовы: цела большасці відаў грыбоў уяўляе сабой міцэлій (грыбніцу), які складаецца з тонкіх ніцей – гіфаў.

6. Месца рэгістрацыі: усюды дзе ёсць арганіка – лес, поле, вада, глеба, прадукты харчавання, на рэштках адмерлых раслін і жывёл, на жывых арганізмах.

7. Род заняткаў: гетэратрофы, сапратрофы, паразіты, сімбіёнты.

8. Прадаўжэнне роду: бясполае (спорамі, часткамі міцэлія, пачкаваннем), палавое.

**Фізкультмінутка**

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

– А цяпер давайце паглядзім больш уважліва, які выгляд маюць “грамадзяне” гэтага дзіўнага царства. Па класу развешаны карткі з выявамі грыбоў. Вам патрэбна сабраць іх. *Дадатак 1.*

*Пасля абмеркавання з настаўнікам матэрыялу аб тым, што ўсе шапачкавыя грыбы можна раздзяліць на ядомыя і ядавітыя, правілаў збору грыбоў, вучням прапануецца “сабраць у кошык” ядомыя грыбы: дзеці вывешваюць на дошку выявы ядомых грыбоў.*

– На зваротным баку картак з выявамі ядавітых грыбоў прапісаны парадак дзеянняў пры аказанні першай дапамогі пры атручэнні грыбамі. Давайце ўстановім правільны парадак дзеянняў (*вывешваецца на дошцы*):

1. Выклікаць хуткую дапамогу.
2. Даць выпіць не менш 1 л кіпячонай вады.
3. Надавіць на корань языка, выклікаць ірвоту.
4. Паўтараць дзеянні да чыстых прамыўных вод.
5. Каб хутчэй вывесці яд з арганізма, трэба прыняць актываваны вугаль і піць кіпячоную падсоленую ваду ці моцны чай.

**IV. Кантрольна-карэкцыйны этап**

Настаўнік вяртаецца да пытання, якое было прапанавана ў пачатку ўрока, пра фэйк і факт.

Прыблізныя адказы:

– Грыбы – гетэратрофы. Для таго, каб вырасці да такіх памераў, ім патрэбна многа ежы. Паколькі яны вядуць прымацаваны лад жыцця, ежу цяжэй знайсці.

– Іх рост ажыццяўляецца за кошт разрастання тонкіх ніцей – гіфаў у розныя бакі, а не ўверх.

– Грыбы не маюць шкілета, які мог бы падтрымліваць іх цела.

**V. Этап падвядзення вынікаў**

– Такім чынам, грыбы – дзіўныя істоты, але іх будова не разлічана на гіганцкія памеры. Яны ідэальна прыстасаваны да таго, каб быць такімі, якія яны ёсць – часам маленькімі, часам досыць буйнымі, але заўсёды эфектыўнымі ў сваёй ролі ў прыродзе. Яны не маюць патрэбы ў тым, каб быць памерам з чалавека, бо іх сапраўдная “суперсіла” – гэта іх нябачная, падземная частка – грыбніца, якая можа быць велізарнай!

**VI. Этап інфармацыі аб дамашнім заданні**

§ 10, пытанні пасля параграфа.

**VII. Рэфлексія**

***Прыём “Кошык успамінаў”***

– Я вазьму з сабой успаміны аб тым, што ...

**Літаратура**

1. Лісаў, М.Д. Біялогія: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / М.Д. Лісаў – Мінск. Народная асвета, 2022.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА